# ГІСТОРЫЯ

УДК 327(476)

***М.Э. Часноўскі***
*д-р гіст. навук, праф., заг. каф. міжнародных адносін*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
e-mail: m.chasnouski@gmail.com

## ЕЎРАПЕЙСКІ СЕГМЕНТ СУЧАСНАЙ ГЕАПАЛІТЫКІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

*Даследуецца еўрапейскі напрамак геапалітыкі Рэспублікі Беларусь. Зыходны пункт аналізу: з улікам уласнай геапалітычнай вагі краіна ў сучасных абставінах можа іграць на міжнароднай арэне толькі ў камандзе. Яе аптымальны геапалітычны выбар дзеля рэалізацыі знешніх мэтаў на еўрапейскай прасторы – мецьдвух і больш моцных партнёраў, на якіх можна абаперціся, каб гарантаваць магчымасці знешнепалітычнага манеўру, а стратэгіяй дасягнення поспеху павінны выступаць палітыка «разумнай сілы», неканфрантацыйныя адносіны, дыялог і кампрамісы. Захаваць геапалітычную раўнавагу краіны ў еўрапейскіх працэсах дапамогуць унутраныя сродкі – інавацыйныя здольнасці краіны і нацыянальна-палітычная кансалідацыя грамадства.*

**Уводзіны**

Заняпад постсавецкай прасторы пасля распаду СССР спарадзіў асаблівыя адносіны міжнароднай супольнасці да яго дзяржаў-нашчадкаў. Яны сталі ацэньвацца як другасныя, лімітрофныя краіны. Нездаровы патэрналізм да іх уласцівы і Еўрапейскаму саюзу. Дэпутат Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь В.І. Варанецкі лічыць, што «Еўрасаюз з самага пачатку… не ўлічваў геапалітычны кантэкст развіцця нашага рэгіёна. Таму па вялікім рахунку можна сказаць, што знешняя палітыка Еўрасаюза не змагла вырашыць ні адной з праблем усходняга рэгіёна. І больш за тое, спроба сфарміраваць гэты рэгіён, зыходзячы са сваіх інтарэсаў, задач і каштоўнасцей, прывяла да таго, што тут абвастрыўся крызіс, узніклі дадатковыя супярэчнасці і складанасці» [1]. Расія таксама мерамі «мяккай», а часам і «жорсткай сілы» – з рознай ступенню паспяховасці – паставіла большасць былых савецкіх рэспублік у стан залежнасці ад сябе. Прыглушанае прыкладна да 2008 г., а затым адкрытае суперніцтва ЕС і Расіі за дамінаванне на постсавецкай прасторы спарадзіла адкрыты канфлікт. Шэраг краін – удзельніц СНД аказаўся пад двайным геапалітычным прэсінгам. Такі знешнепалітычны стан абцяжарвае іх магчымасці паўнавартасна ўплываць на працэсы функцыянавання як сваіх субрэгіёнаў, так і рэгіёна ЦУЕ ўключацца ў вырашэнне агульнаеўрапейскіх праблем. На фоне паляпшэння ўзаемасувязей з ЕС адносіны Рэспублікі Беларусь з ключавым саюзнікам – Расійскай Федэрацыяй – падвергліся рэвізіі і перайшлі ў фазу крызісу па шэрагу найважнейшых напрамкаў (ваеннае, нафтавае, гандлёвае, культурнае і палітычнае ўзаемадзеянне). Беларусі, якая прымкнула да больш слабага паводле колькасці насельніцтва, эканамічнага і ваеннага патэнцыялу, але гістарычна блізкага боку, наканавана выправіць перакос за кошт пашырэння колькасці стратэгічных партнёраў.

Рэспубліка Беларусь не звышдзяржава, нават не рэгіянальны лідар. У сучасных абставінах яна можа іграць на міжнароднай арэне толькі ў камандзе. Згаданая дзейнасць прыносіць рэальныя, а часам віртуальныя вынікі. Такая логіка рэалізацыі геапалітычных прыярытэтаў. Разам з тым і віртуальны вынік нельга лічыць бессэнсоўным ці такім, што мае нулявы эфект. Такі вынік дае вопыт знешнепалітычнай дзейнасці, прымушае аптымізаваць крокі, манеўраваць на знешнім полі, шукаючы больш прыдатныя варыянты рэалізацыі нацыянальных мэтаў.

Геапалітычная фабула, абумоўленая выбарам знешнепалітычных прыярытэтаў, праверана гістарычнай практыкай. Яе сутнасць: самымі важнымі партнёрамі бываюць перш за ўсё краіны-суседзі. Для Беларусі ролю параўнальнага з Расіяй эканамічнага партнёра ўсё больш упэўнена іграе Еўрапейскі саюз. Гэта адбываецца насуперак «халодным» палітычным адносінам паміж двума суб'ектамі. Расія з аднаго боку і ЕС з другога былі і застаюцца для Беларусі асноўнымі і амаль раўназначнымі цэнтрамі палітычнага, эканамічнага і культурнага прыцягнення [2, с. 38–39]. Вядучая геапалітычная калізія зводзіцца да імкнення як Расіі, так і Еўрасаюза прапанаваць свой сцэнарый. Яго мэта – «перацягнуць» еўрапейскую дзяржаву на свой бок. «Перацягванне» становіцца больш інтэнсіўным у перыяды абвастрэння адносін паміж абодвума актарамі.

Стрыжнем знешняй стратэгіі сучаснай Беларусі ў такіх умовах выступае пазбяганне канфрантацыі з моцнымі суседзямі, якая можа прывесці да непапраўных геапалітычных вынікаў. Разнастайныя ініцыятывы па еўрапейскай праблематыцы – сведчанне пэўнай актыўнасці краіны. Нельга пагадзіцца з павярхоўнымі меркаваннямі аб маргінальнасці Рэспублікі Беларусь на еўрапейскай арэне, ацэнкай яе як «палітычнага ізгоя» [3, с. 5]. Аднак арсенал метадаў і сродкаў геапалітычнага ўплыву Беларусі на еўрапейскія працэсы яўна абмежаваны і вымагае карэкціроўкі. Беларусі, як дзяржаве з абмежаванымі геапалітычнымі магчымасцямі, неўласціва выкарыстоўваць «жорсткую сілу». Міжнародная практыка паказвае, што ў такіх сітуацыях практычна любой краіне – аналагу Беларусі прыходзіцца лавіраваць, каб не скаціцца ў канфрантацыю з тым ці іншым знешнім апанентам. Яскравы прыклад – пазіцыя афіцыйнага Мінска па пытанні прыналежнасці Крыма. Факт непрызнання Беларуссю на афіцыйным узроўні далучэння Крыма да Расіі выглядае абсалютна апраўданым. Яшчэ ў сакавіку 2014 г. прэзідэнт А. Лукашэнка сказаў, што Крым сёння – гэта частка тэрыторыі Расійскай Федэрацыі і нічога не зменіцца ад таго, прызнае гэта хтосьці ці не. Згаданая заява лягла ў аснову беларускай пазіцыі па дадзеным пытанні. Прасцей кажучы, Мінск ужо даўно прызнаў факт далучэння паўвострава да Расіі і толькі фармальна заяўляе аб сваёй нейтральнай пазіцыі, не жадаючы, відавочна, абвастраць адносіны з Захадам. Такое геапалітычнае манеўраванне зусім не шкодзіць нацыянальным інтарэсам Беларусі.

У сучасных міжнародных рэаліях узнікаюць абставіны непераадольнай сілы – крызісы, канфлікты, масавыя выступленні, хаос і да т.п. Захаванне нацыянальнай бяспекі ў такіх умовах вымушае прымяняць сілавыя метады, істотным складнікам якіх выступае іх інфармацыйная падтрымка. Такія інфармацыйныя аперацыі ў сукупнасці з выкарыстаннем ваенных сродкаў, спецыяльна арыентаваных дзеянняў грамадскіх інстытутаў, прапаганды ў СМІ, мер палітыка-дыпламатычнага, фінансава-эканамічнага, культурнага, спартыўнага, дзелавога, навукова-асветніцкага зместу атрымалі назву «гібрыдных войн». Апошнія сталі стрыжнем палітыкі «мяккай сілы».

Як у любой вайне, у гібрыднай ёсць агрэсар і ахвяра. Рэспубліка Беларусь з пункту погляду свайго геапалітычнага патэнцыялу і з улікам дактрыны нацыянальнай бяспекі абвяргае ініцыятыўнае выкарыстанне метадаў «гібрыднай вайны», а значыць – палітыку «мяккай сілы». А вось для інфармацыйнага процідзеяння геапалітычным канкурэнтам, якія скіравалі супраць нас сродкі «гібрыднай вайны», краіна павінна быць гатовай.

Аптымальны варыянт выкарыстання Беларуссю свайго ўплыву ў міжнародных адносінах – стратэгія «разумнай сілы». Як вядома, яна ўзнікла ў выніку сусветнай эканамічнай глабалізацыі і ўтварэння яе прадукта – суперкангламерата, складзенага з групы фінансава-крэдытных і транснацыянальных карпарацый, якія валодаюць львінай доляй сусветнага «эканамічнага пірага». Суперкангламерат дае прастор ініцыятыве не толькі дзяржавам-гігантам, але і тэхналагічна «прасунутым» сярэднім і малым краінам, якія здольны манеўраваць «разумнай сілай» *(«smart power»)* як сінтэзам «жорсткай» і «мяккай». Стратэгія «разумнай сілы» – найбольш верагодны бонус для росту значнасці Бе-

ларусі. Краіна валодае неабходнымі складнікамі, каб, карыстаючыся згаданай стратэгіяй, павышаць уласную эфектыўнасць, здольнасць да стратэгічнага выбару і манеўру, выгаднай інтэграцыі з сусветнымі цэнтрамі – нават незалежна ад сваёй геапалітычнай вагі. Выпрацаваўшы і ўдала апрабіраваўшы стратэгію «разумнай сілы», Рэспубліка Беларусь здолее праводзіць «сваю лінію» міжнародных паводзін (канстытуцыйна абумоўленую стратэгію роўнааддаленасці ад блокаў, кааліцый, звышдзяржаў).

Патэнцыял «разумнай сілы» Беларусі сканцэнтраваны ў магчымасцях развіцця ІТ-індустрыі, лічбавай эканомікі, рынкавых адносін, геаэканамічнага манеўравання, здольнасцях генерыраваць і выкарыстоўваць інавацыі, у наяўнасці сучаснага навукова-інтэлектуальнага кадравага сегмента, у ступені нацыянальна-палітычнай кансалідацыі. Як паказальны прыклад назавём найноўшую распрацоўку Мінскага трактарнага завода – ІТ-трактар. Ідэнтычных трактараў на постсавецкай прасторы пакуль не выпускаюць. У сусветных вытворцаў такія ёсць, аднак каштуюць у 1,5 раза даражэй за беларускія (яго кошт – 200 тыс. еўра). Трактарыст можа задаць машыне любую праграму, і яна, звязаўшыся са спадарожнікам, сама пачне, напрыклад, засяваць поле.

У каардынаты «разумнай сілы» ўпісваецца ўдзел дзяржавы ў знешнепалітычнай каманднай гульні. У апошнія гады Беларусь здзяйсняла тут даволі эфектыўныя крокі. Варта нагадаць ініцыятыўную ролю Мінска ў наладжванні перамоў па вырашэнні крызісу ва Украіне, прасоўванне ініцыятывы «Хельсінкі-2», прапановы развіцця больш цеснага ўзаемадзеяння паміж еўрапейскім і еўразійскім інтэграцыйнымі працэсамі. Асноўнай геапалітычнай асаблівасцю Рэспублікі Беларусь у сістэме еўрапейскіх адносін з’яўляецца тое, што яна вымушана практычна гуляць у дзвюх камандах, прычым па вельмі адрозных «нотах», паколькі размешчана паміж канфрантацыйнымі палюсамі (Расіяй і Еўрасаюзам) і мае з імі выразна асіметрычныя адносіны. І тут варта пагадзіцца з выкладкамі вядомага беларускага эксперта па пытаннях міжнароднага жыцця Я. Прэйгермана, які на інтэрнэт-партале minskdialogue.by паказаў, што два наратывы: класіфікацыя Беларусі як расійскага геапалітычнага прыдатку і выбудоўванне логікі беларускай знешняй палітыкі выключна на спецыфіцы палітычнай сістэмы дзяржавы – з’яўляюцца недапушчальным спрашчэннем. У сапраўднасці беларуская дзяржава, хоць і па вызначэнні няздольная праводзіць самастойную еўрапейскую палітычную лінію, але мае і адстойвае шэраг рэгіянальных геапалітычных прыярытэтаў, якія да таго ж зараз аказаліся аголеным нервам вялікай міжнароднай палітыкі. Зыходзячы з гэтага, для краіны акрэсліваецца галоўная геапалітычная запаведзь – трымацца ў баку ад процістаяння і захоўваць неканфрантацыйныя адносіны з абодвума палюсамі сілы. Місія звышскладаная, яна атаясамлівае геапалітычную стабільнасць Беларусі як своеасаблівы чамадан без ручкі: несці неабходна, але трымаць цяжка.

Як ацэньваюць асаблівасці геапалітычнай стабільнасці Рэспублікі Беларусь яе еўрапейскія партнёры? Сучасная ацэнка Захадам феномена геапалітычнага стану Беларусі прыкладна такая: асцерагаючыся, што Захад можа падтрымаць выступленне кшталту Майдана супраць прэзідэнта А. Лукашэнкі, а таксама адчуваючы патрэбу ў заходніх інвестыцыях для стымулявання эканамічнага росту (празмерна залежнага ад расійскай эканомікі, якая перажывае скарачэнне) ў перыяд рэцэсіі, беларускі прэзідэнт прапанаваў стаць пасрэднікам у канфрантацыі паміж Расіяй і Захадам з-за Украіны. Анексія Крыма У. Пуціным і распальванне канфлікту на ўсходзе Украіны таксама заставілі А. Лукашэнку асцерагацца, што Расія можа распачаць падобныя дзеянні ў Беларусі, калі палічыць, што яе інтарэсы там знаходзяцца пад пагрозай. Таму беларускі лідар паступова пачаў спрабаваць паляпшаць адносіны з Захадам, у той жа час пакідаючы сувязі ў галіне бяспекі і стратэгічны саюз з Масквой, падтрымка якой неабходная яму для захавання сваёй улады.

Паводле існуючага ў колах расійскіх экспертаў меркавання, вызначальны аспект сённяшняй знешняй палітыкі Беларусі – гэта спробы вызваліцца з-пад расійскай сферы кантролю. Яны з'явіліся менавіта ў той час, калі ў Еўропе палітычнае асяроддзе стала змяняцца на карысць Расіі: выбары ў Еўропе сталі прыводзіць да ўлады партыі, больш схільныя да Масквы. У гэтых умовах крокі Беларусі на Захад у расійскім уяўленні – гэта прывід яшчэ адной «каляровай рэвалюцыі» на сваім парозе ўслед за Украінай.

Стрыжань афіцыйнай беларускай геапалітычнай лініі – знайсці баланс ва ўзаемадзеянні з Расійскай Федэрацыяй і Захадам, прадухіліць магчымасць развіцця паталагічных форм Саюза Беларусі і Расіі (аж да паглынання Беларусі), уключэння Масквой істотных рэінтэграцыйных козыраў, пераважна эканамічных і культурна-цывілізацыйных. Мінску важна, каб падтрымка з боку ЕС не разбурала яўным чынам саюзныя адносіны паміж Беларуссю і Расіяй. Любы адваротны вырыянт – надзвычай непажаданы; апрача ўсяго, ён намнога павысіў бы нестабільнасць у рэгіёне ЦУЕ.

Беларуская апазіцыя пастаянна вылучае тэзіс: узамен на крамлёўскія датацыі і танныя энергарэсурсы Беларусь паступова, год за годам, страчвае сваю самастойнасць, становячыся ўсё больш залежнай ад Расіі. Згаданы тэзіс, як мяркуецца, варта расцэньваць не толькі для самазапалохвання беларусаў, але і як верагодны. Сапраўды, Беларусь расцэньваецца Масквой як жыццёва важная буферная зона, якая аддзяляе Расію ад НАТА і Захаду. Геаграфічнае размяшчэнне Беларусі, якая мяжуе з трыма членамі Паўночнаатлантычнага альянсу (Польшчай, Літвой і Латвіяй), надае краіне бясспрэчнае значэнне для Расіі, якое толькі вырасла з 2014 г. на фоне падзей ва Украіне.

Заўважым: і Захад, і Расія ўспрымаюць Беларусь як краіну, якая мае яўны геапалітычны патэнцыял, здольны ўплываць на еўрапейскія працэсы. Такую здольнасць палітыка-кан'юнктурна не ўлоўлівае беларуская апазіцыя.

Геапалітычны працэс – гэта «броўнаўскі рух», здольны ў адзін момант скарэкціраваць, змяніць, нават перакуліць палітычную карту. Гэта ўласцівасцьназіраецца і зараз. Хісткасць сучаснага стану стабільнасці ў свеце вызначаецца канфрантацыяй паміж Расіяй і ЗША. У апошні час канфрантацыя стабілізавалася, стала «нормай» адносін; гэта добрая навіна. Дрэнная навіна: на фоне крызісу ва Украіне стан праціборства набыў рысы ваенна-палітычнага супрацьстаяння на ўсходзе Еўропы, спалучыўшыся там з нарошчваннем узбраенняў. Тым самым востра закранаюцца жыццёвыя інтарэсы Рэспублікі Беларусь. Пацвярджэннем прагучала заява расійскага міністра абароны С. Шойгу, зробленая ў ліпені 2018 г., аб бесперапынным удасканаленні баявога складу войск і сістэм іх базіравання на заходнім стратэгічным напрамку, што выклікана, паводле яго слоў, сітуацыяй, якая склалася. З 2016 г. войскі атрымалі каля 5 тыс. адзінак новага і мадэрнізаванага ўзбраення і тэхнікі. Асаблівая ўвага надаецца супрацоўніцтву з беларускімі ваеннымі, адзначыў расійскі міністр.

У сітуацыі, якая ўзнікла, беларускае кіраўніцтва намагаецца весці палітыку «разумнай сілы». Яго пазіцыя па праблеме спынення агню на паўднёвым усходзе Украіны дазволіла пачаць працэс нармалізацыі адносін з Захадам, затое прывяла да прыкметнай незадаволенасці з Усходу. Паводле меркавання шматлікіх экспертаў, Мінск зараз падвяргаецца беспрэцэдэнтнаму ваенна-палітычнаму ціску з боку Крамля, які імкнецца ўцягнуць яго ў процістаянне з Захадам. Можа здацца, што Беларусь апынулася перад складаным геапалітычным выбарам: з Захадам адносіны няхай паволі, але наладжваюцца, затое галоўны саюзнік дэманструе скараціць субсідыі і рэальна пагражае дэстабілізацыяй. На справе выбару ў беларускага кіраўніцтва няма. Яно разумее: калі Масква націсне ўсур'ёз, то доўга супраціўляцца не атрымаецца. Да таго ж і непасрэдныя суседзі Беларусі, краіны Балтыі, Польшча, Украіна, слаба верацЬ у гарантаваную адсутнасць пагроз супраць яе тэрыторыі.

Палітыка «разумнай сілы» грунтуецца на прадуманай тактыцы кампрамісаў. Складанасць для беларускага боку атрымліваць ад яе плён выказана міністрам замежных спраў У.У. Макеем на сумесным пасяджэнні калегій МЗС Беларусі і Расіі ў лістападзе 2016 г. пры характарыстыцы стану сучасных міжнародных адносін. «Мы ва ўсё большай ступені сутыкаемся з дэфіцытам гатоўнасці да кампрамісаў. У гэтай сітуацыі ніхто не можа адчуваць сябе бяспечна, – адзначыў ён. – Мы жывём ва ўзаемазвязаным свеце. Новыя выклікі і пагрозы ў той ці іншай ступені закранаюць усе краіны незалежна ад іх памераў і стану» [4]. Словам, Беларусь аказалася ў сітуацыі геапалітычнага разрыву, калі, з аднаго боку, пачуццё самазахавання падказвае, што варта паціху знаходзіць агульную мову з Еўропай і Вашынгтонам, а з другога – стрымлівае залежнасць ад Масквы ў эканамічнай, палітычнай і ваеннай сферах. І пры тым апошняя раўніва сочыць, каб Беларусь не перасекла пэўнай «чырвонай лініі», рубеж якой зноў жа вызначае Крэмль. Ясна адно: носьбіту «разумнай сілы» ніяк не адпавядае сцвярджэнне ўкраінскіх экспертаў, што Расія намерана «прыплюсаваць» патэнцыял Беларусі да ўласнага патэнцыялу, да сваіх кіламетраў мяжы з Украінай – «беларускія кіламетры» і стварыць дадатковыя магчымасці для поўнамаштабнага нападу на Украіну. Такі сцэнарый сведчыў бы аб фактычнай акупацыі Беларусі, азначаючы, паводле Ф. Фукуямы, «канец гісторыі» – толькі навыварат.

Новыя рэаліі ўзніклі праз непрадказальную палітыку амерыканскага прэзідэнта Д. Трампа, якая зблытала карты НАТА адносна Беларусі і Украіны. Засяродзіўшыся на праблемах уласнай ціхаакіянскай палітыкі (небяспека, што на фоне дынамізацыі паўночнакарэйскай ядзернай праграмы Паўднёвая Карэя перастане верыць амерыканскім заявам і зоймецца стварэннем уласнай ядзернай зброі, да падобных высноў можа прыйсці і Японія), Трамп закіне еўрапейскія праекты НАТА. Узнікне новы сцэнарый: поўнае фіяска пацерпіць усходняя палітыка ЕС, а Расія, цалкам атрымаўшы ва ўласную сферу ўплыву Украіну і Беларусь, зоймецца там рэстаўрацыяй савецкіх (расійскіх) парадкаў. Паводле меркавання шэрагу заходніх аналітыкаў, якраз такога сцэнарыя асцерагаецца беларускі прэзідэнт А. Лукашэнка. Ускосным сведчаннем гэтага сцвярджэння з’яўляецца яго перыядычны зварот да праблемы захавання суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, прадухілення небяспекі трапіць у лімітрофны стан іператварыцца ў эксперыментальнае поле адраджэння расійскай імперыі.

Мяркуем, што міжнародны статус Рэспублікі Беларусь, яе курс на дасягненне нейтралітэту, роля на еўрапейскай геапалітычнай сцэне, пазіцыя беларускай нацыі (з пэўнай агаворкай) не давядуць да такой развязкі. Горшы варыянт абмяжуецца традыцыйнымі канфліктамі, калі Мінск і Масква, нягледзячы на агульную саюзніцкую рыторыку і знаходжанне дэ-юрэ ў адзінай эканамічнай прасторы, з перыядычнасцю, вартай лепшага прымянення, уваходзяць у жорсткі клінч. Гісторыя згаданых канфліктаў атрымала свае назвы: газавая, малочная, калійная і іншыя войны, а таксама павышэнне тарыфаў на транзіт расійскай нафты і газу. Пасля паспяховай развязкі чарговай вайны звычайна застаецца нядобры «смак».

Сама Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі, падышоўшы да 20-гадовага юбілею ў красавіку 2017 г., набыла абрысы, далёкія ад ідэальных. Рознагалоссі ў яе межах выцякалі з-за коштаў на энерганосьбіты, парадку паставак прадуктаў харчавання, стварэння суседам памежных зон. Інтэграцыйныя праекты ў рамках ЕАЭС адносна Беларусі ў большасці таксама носяць калі не чыста палітычны змест, то палітычны падтэкст. Так, праз палітычныя рознагалоссі Мытны кодэкс ЕАЭС уступіў у сілу з 1 студзеня 2018 г. (замест запланаванага 1 ліпеня 2017 г.), а беларускі прэзідэнт афіцыйна падпісаў яго са спазненнем – у красавіку 2017 г., хоць лідары астатніх членаў аб’яднання гэта зрабілі яшчэ ў канцы 2016 г.

Наколькі дапаможа беларускі нейтралітэт захаванню суверэннай дзяржавы? Ні «ястрабы», ні аптымісты, ні песімісты, ні рэалісты на Захадзе ўсур'ёз не ўспрымаюць слоган пра беларускі нейтралітэт. Пануе меркаванне, што краіна, уваходзячы ў АДКБ, не можа гаварыць аб нейтралітэце. Аднак рэалісты (а такіх нямала) разумеюць, што гэты лозунг – спроба беларускага кіраўніцтва ва ўмовах нарастаючай напружанасці паміж Расіяй і Захадам, Расіяй і ЕС, Расіяй і Вялікабрытаніяй знайсці сваё месца на карце і пазбегнуць канфрантацыі.

**Рубяжы росту геапалітычнай вагі Беларусі ў Еўропе**

Крокаў афіцыйнага Мінска пакуль мала, каб павысіць еўрапейскую вагу дзяржавы, але дастаткова, каб захаваць што ёсць. Тут важна дадаць істотны момант: краіне патрэбны сапраўдны дыялог, а не яго ранейшая імітацыя, аднак беларускае кіраўніцтва пры яго выбудоўванні прынцыпова вымушана ўлічваць пазіцыю саюзніка – Расійскай Федэрацыі – і грунтаваць дыялог не на процілегласцях Масквы і Захаду, а на супрацоўніцтве. Відавочна, беларускаму лідару ўдалося пераканаць Еўрапейскі саюз, што абвешчаная шматвектарная палітыка Рэспублікі Беларусь – не толькі спосаб паменшыць залежнасць ад усходняга суседа, але і сапраўднае імкненне адстойваць пэўныя нацыянальныя інтарэсы на Захадзе, у прыватнасці ўмацоўваць дзяржаўны суверэнітэт і незалежнасць, бяспеку і стабільнасць краіны. Прынятае ў лютым 2016 г. рашэнне ЕС аб адмене большасці санкцый у адносінах да Беларусі адкрыла для гэтага новыя магчымасці. Асаблівасцю пачатку апошняга этапа беларускага-еўрасаюзных адносін стаў зрух акцэнтаў Бруселя ад негалоснай падтрымкі апазіцыі да актыўнага супрацоўніцтва на афіцыйным узроўні. Праяўленая гатоўнасць ЕС і яго краін-членаў актывізаваць супрацоўніцтва з Беларуссю цалкам адпавядае курсу афіцыйнага Мінска, які ўсё ж перманентна падкрэслівае важнасць не палітызацыі, а прагматызацыі пазіцый. Сапраўды, дыпламатычны прарыў неабходна замацоўваць эканамічнымі механізмамі.

У гэтым сэнсе становіцца зразумелым агучваемае Мінскам жаданне бачыць моцны Еўрапейскі саюз. Ментальна яно выглядае дысанансам, таму што беларускае кіраўніцтва не падзяляе еўрапейскія каштоўнасці. Зноў жа, беларускі партнёр па Саюзнай дзяржаве Расія яўна не прыхільнік моцнага Еўрасаюза. Аднак перавышае класічная геапалітычная «фішка» – патрэба мець прастору для манеўра. Сапраўды, любой невялікай краіне, асабліва на такім гарачым геапалітычным перасячэнні, дзе пануюць глабальныя актары, заўсёды выгадна мець некалькі партнёраў (можна і саюзнікаў) як падстраховачную падушку на выпадак крызісаў. Гэта дазваляе адчуваць сябе больш свабодна, дадае дадатковыя кропкі апоры для рэалізацыі ўласных інтарэсаў, захавання суверэнітэту, гарантуе не аказацца перад дамінуючым уздзеяннем адной вялікай дзяржавы.

Пэўнае пацяпленне з 2016 г. адносін на лініі Беларусь – ЕС адпавядае нацыянальным інтарэсам, а значыць, геапалітычна апраўданае. У лістападзе Мінск наведала дэлегацыя Камітэта па палітыцы і бяспецы Савета Еўрасаюза. Гэты візіт названы самым маштабным у гісторыі адносін двух актараў. Падчас перагавораў з прадстаўнікамі Камітэта прэзідэнт А. Лукашэнка прапанаваў Мінск як пляцоўку для ўрэгулявання адносін паміж Захадам і Усходам, заявіўшы, што з адменай санкцый з'явіўся шанс для ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва. Беларусь зацікаўлена ў паглыбленні адносін, аднак не ставіла і не ставіць на мэце безаглядна бегчы ў Еўрасаюз, пры гэтым нават парушаючы дзеючыя абавязацельствы з трэцім бокам.

Для Захаду апошнім часам Беларусь працягвала працаваць над сваім іміджам як незалежнага паслядоўнага партнёра, донара рэгіянальнай бяспекі з перспектыўнымі ўмовамі для размяшчэння інвестыцый. Дактрынальна гэтыя намаганні названы будаўніцтвам «платформы супрацоўніцтва на аснове ўзаемапавагі і баланса інтарэсаў». Такі вобраз забяспечвае даволі пасяховыя пазіцыі краіны ў знешняй палітыцы, лепшыя,

чым ва ўнутранай. Там Захад па-ранейшаму крытычна ацэньвае сітуацыю ў галіне правоў чалавека і дэмакратыі. Індыкатарам крытычнасці аказалася прадаўжэнне мандата спецдакладчыка ААН па Беларусі.

Сустрэча ў Мінску кіраўнікоў МЗС Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятывы (пад старшынствам Беларусі), сесія ПА АБСЕ ў ліпені 2017 г., іншыя міжнародныя сустрэчы на беларускіх пляцоўках важныя хутчэй у якасці іміджавага мерапрыемства. Такія падзеі павялічваюць сімвалічны капітал знешняй палітыкі Беларусі, хоць і неістотна, але ўплываюць на вырашэнне актуальных практычных праблем краіны бягучага і перспектыўнага парадку.

У адносінах з усходнім суседам пераважаюць не іміджавыя дасягненні, а нявырашаныя праблемы. У пералік праблем беларуска-расійскага стратэгічнага саюзніцтва трапілі розныя рычагі ўзаемаўплыву бакоў на стан адносін, найбольш істотныя сярод якіх пастаўкі энергарэсурсаў, асаблівасці памежнага кантролю на ўзаемнай мяжы, ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва. Зразумела, іх паспяховае вырашэнне ў рэчышчы беларускіх чаканняў павялічыла б геапалітычную вагу краіны. Так, практычна перманентна вядуцца перагаворы аб умовах паставак расійскіх энергарэсурсаў у Беларусь: Мінск зацікаўлены ў захаванні льготнага рэжыму атрымання нафты і газу. Беларусь сапраўды ўжо больш за 20 гадоў атрымлівае нафту і газ па льготным тарыфе, аднак Масква стала абмяжоўваць памер сваіх датацый, патрабуючы ад прэзідэнта А. Лукашэнкі, каб той актыўней падтрымліваў яе на міжнароднай арэне і стварыў спрыяльныя ўмовы для расійскага бізнесу ў сваёй краіне. У адказ за кожны выгадны Маскве крок Мінск выстаўляе новы рахунак. У выніку ўзнікаюць гандлёвыя войны. Разам з тым неабходна ўлічваць, што сусветны дысбаланс, пры якім адны рэгіёны кантралююць энергетычныя рэсурсы, тады як іншыя маюць у іх вострую патрэбу, у будучым захавае сваю значнасць пры размеркаванні эканамічнай і палітычнай улады, а таксама стратэгічнага ўплыву. Хоць вядомыя нам мадэлі спажывання і вытворчасці зведаюць істотныя змены, аднак на Беларусі яны рэальна не адаб’юцца.

Мінску не падабаецца, што з лютага 2017 г. на беларуска-расійскай мяжы Масква ўвяла паўнавартасны памежны кантроль. Не вырашана праблема ўзаемнага прызнання віз замежных дзяржаў. Расійскі бок патрабуе ажыццяўляць беларускі транзіт прадуктаў нафтаперапрацоўкі праз свае парты. Але з улікам транзітнага характару беларускай гандлёвай прасторы кіраўніцтву важна разумна іграць уласнымі козырамі дзеля захавання выгадных лагістычных калідораў. Пры гэтым не сапсаваць адносіны з сумежнымі краінамі – партнёрамі па эксплуатацыі згаданых калідораў. Тут галоўны нерв напружанасці – расійскія планы ўвязкі ў адзін пакет выдзяляемых аб’ёмаў пастаўкі нафты для Беларусі і транзіту нафтапрадуктаў праз свае парты з аднаго боку і непазбежныя праблемы ў адносінах з Літвой і Латвіяй з другога. Для беларускага кіраўніцтва застаюцца хвалюючай загадкай расійскія памежныя ініцыятывы. Некаторыя аналітыкі дапускаюць, што ўстаноўка памежных слупоў, набываючыя жорсткасць эканамічныя ўмовы і яўная антыбеларуская інфармацыйная кампанія сведчаць аб крызісе ў двухбаковых адносінах і пагрозе для беларускай незалежнасці і суверэнітэту, а як мінімум – аб эканамічным прэсінгу адносна Беларусі.

Яшчэ адной складанай тэмай застаецца ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва. Расія адмаўляе Беларусі ў пастаўках найноўшага ўзбраення (самалёты, ракетныя комплексы) нават за аплату. З усяго згаданага акрэсліваецца геапалітычная калізія: па-першае, Масква не вельмі давярае свайму саюзніку і імкнецца плаціць за саюзніцтва па мінімуму; па-другое, жадае выдавіць згоду Мінска на размяшчэнне сваіх ваенных баз на беларускай тэрыторыі; па-трэцяе, у 2020 г. заканчваецца тэрмін пагаднення аб знаходжанні ў Беларусі двух ваенных аб’ектаў пад Ганцавічамі і Вілейкай, і ўмовы новага пагаднення патэнцыяльна становяцца прадметам вострых дыскусій паміж саюзнікамі.

Пакуль ясна адно: у Крамлі яшчэ не прынята канчатковага рашэння, якая менавіта форма ціску найбольш падыходзіць адносна Беларусі сёння. Таму з усёй мазаікі праблем акрэсліваецца тое, што пакуль па-эзопаўску агучваецца беларускім кіраўніцтвам: неабходна пакончыць з моназалежнасцю ад Масквы шляхам захавання добрых адносін і з Расіяй, і з Еўрасаюзам. Стратэгіі «разумнай сілы» цалкам адпавядае выраз «У крызіснай сітуацыі мець падушку бяспекі», які ўсё часцей агучваецца ў апошні час. А дзеля гэтага неабходна спавядаць прынцып дыверсіфікацыі ў міжнародных адносінах і пазбягаць залежнасці ад адной крыніцы, напрамку супрацоўніцтва.

У гэтым сэнсе для Рэспублікі Беларусь надзвычай моцна ўзрастае геапалітычны кошт збліжэння з Кітаем. Шмат гаворыцца аб тым, што Беларусь становіцца плацдармам для выхаду Кітая на расійскі і еўрапейскі рынкі, што тавараразварот паміж дзвюма краінамі імкліва расце. Аднак рэаліі больш сціплыя. Рыторыка СМІ Літвы, Польшчы, Латвіі, іншых сярэднееўрапейскіх краін па дадзенай тэме практычна супадае з беларускай: кожная з краін-суседак лічыць сябе тым самым плацдармам для выхаду кітайскай эканомікі на еўрапейскія рынкі. Эксперты ж лічаць, што геаграфічная блізкасць да ЕС – не самы важны фактар. Нашмат важнейшая інстытуцыянальная збліжанасць партнёра, у прыватнасці наяўнасць дагавора аб свабодным гандлі. У гэтым плане набліжаныя да Еўрасаюза Малдова і Украіна больш прывабныя для Кітая, чым Беларусь. Дынамічны рост расійска-кітайскага эканамічнага ўзаемадзеяння таксама сведчыць, што Беларусь перастала быць прывабнай для Кітая як пляцоўка для выхаду на рынак ЕАЭС.

У знешняй гандлёва-інвестыцыйнай сферы для Беларусі таксама застаецца больш праблем, чым рашэнняў. Беларускія ўлады трымаюцца за прыярытэтнае супрацоўніцтва з Кітаем, спадзеючыся прабіцца на агромністы рынак Паднябеснай. Але туды ўвесь свет імкнецца зайсці, і з улікам глабальнай канкурэнцыі шансаў у Беларусі няшмат. Зараз двухбаковыя эканамічныя адносіны – прадпрымальніцкія рызыкі для беларускага боку. Вялікія звязаныя крэдыты кітайскага боку заганяюць Беларусь у фінансавыя праблемы. Варта ствараць альтэрнатыву кітайскаму вектару ў асобе заходняга: яго інвестыцыйныя ўмовы больш выгадныя. Аднак тут маецца шэраг перашкод. У Беларусі толькі на паперы прывабны інвестыцыйны клімат, на справе часта змяняюцца правілы гульні, і гэта адштурхоўвае заходні бізнес. Агульны імідж эканомікі краіны пакуль слаба прэзентацыйны.

Яшчэ ў маі 2015 г., выступаючы на цырымоніі адкрыцця «Кітайска-Беларускага эканамічнага і гандлёвага форуму», старшыня КНР Сі Цзіньпін падкрэсліў унікальнасць геаграфічнага размяшчэння Беларусі і вызначыў яе важнасць менавіта як транспартна-лагістычнага хаба паміж Еўропай і Азіяй. Гэта азначае, што Беларусь бачыцца Пекіну не самадастатковым суб’ектам, а пераважна інструментам выхаду да Балтыйскага мора. Кітайскі бок не выказваецца адносна стварэння ў Беларусі сваіх тэхналагічных цэнтраў, аб чым з асалодай гавораць беларускія чыноўнікі. Ды і стварэнне названага хаба пакуль чакае свайго часу; а ў цэлым лагістыка Беларусі патрабуе неадкладнай дынамізацыі: у рэйтынгу 160 краін свету па яе эфектыўнасці краіна ў 2017 г. заняла толькі 103-е месца (праўда, годам раней яна была ўвогуле на 120-м месцы [5]). Уяўляецца, што ў геапалітычным сэнсе беларуска-кітайскае збліжэнне можа адыграць для Мінска лёсавызначальную ролю, стаўшы для яго трэцім стратэгічным актарам. Ён будзе здольны «размыць» расійскую непрыхільнасць да існуючай альтэрнатывы: Беларусь з Расіяй ці з Захадам?

**Інавацыйнасць, кансалідацыя нацыі як крыніцы павышэння геапалітычнага ўплыву Беларусі**

Дзеля павышэння геапалітычнага ўплыву на еўрапейскія працэсы, росту рэгіянальнага аўтарытэту Рэспубліка Беларусь павінна прыкласці намаганні, накіраваныя на:

1) аздараўленне дэмаграфічнай сітуацыі, што павысіць геапалітычны патэнцыял Беларусі і яе прыцягальнасць для якаснай іміграцыі;

2) умацаванне энергетычнай бяспекі беларускай дзяржавы;

3) структурную, інтэлектуальную і тэхналагічную мадэрнізацыю нацыянальнай інфармацыйнай прасторы;

4) актуалізацыю здольнасцей інфармацыйнай бяспекі Рэспублікі Беларусь;

5) удасканаленне нацыянальнай сістэмы інтэлектуальнай уласнасці як шлях павышэння аўтарытэту краіны ў гуманітарнай сферы;

6) нацыянальна-палітычную кансалідацыю як сродак зближэння ментальных арыентацый беларусаў, геапалітычнай устойлівасці дзяржавы і здольнасці паступовага руху да ўзроўню перадавых краін свету;

7) павышэнне ўплыву беларускай мовы як фактару нацыянальнай кансалідацыі і пераўтварэння ўнутранага свету беларускай нацыі;

8) гарманізацыю стану рэгіянальнай гістарычнай самасвядомасці беларусаў.

Крызісныя з'явы сацыяльна-эканамічнага, дэмаграфічнага, экалагічнага характару ў Беларусі, ахапіўшы 1990-я гг., цалкам не пераадолены і зараз. Між тым іх вырашэнне забяспечвае геапалітычную ўстойлівасць дзяржавы, не кажучы аб павышэнні яе здольнасці «падцягвацца» да ўзроўню перадавых краін свету. Дзеля гэтага робяцца пэўныя крокі. Так, афіцыйная дэлегацыя Беларусі ў ліпені 2018 г. прадставіла на абмеркаванне сесіі ПА АБСЕ прапанову аб развіцці лічбавай эканомікі, увязаную з пытаннямі эканамічнага росту ў рэгіёне АБСЕ, выдаленні розных перашкод і бар'ераў, гарманізацыі стандартаў. Зразумела, падобныя захады важна пашыраць.

Па-ранейшаму сацыяльнай сферы краіны ўласціва абвостраная дэмаграфічная сітуацыя. Смяротнасць сярод насельніцтва, перавысіўшы нараджальнасць, спарадзіла дэпапуляцыю, якая ахапіла гарадскую і сельскую мясцовасць. Дэстабілізацыя эканомікі, нізкі паказчык яе развіцця, дэградацыя сацыяльнай сферы, экалагічныя наступствы катастрофы на ЧАЭС, дэмаграфічны пераход краіны на новы тып узнаўлення насельніцтва, распаўсюджванне яго негатыўных самазахаваўчых паводзін – увесь комплекс згаданых праблем перашкодзіў нарошчванню тэмпаў структурных пераўтварэнняў, стварыўшы пагрозу нацыянальнай бяспецы. Негатыўныя дэмаграфічныя тэндэнцыі даюць падставы ацэньваць дэмаграфічную сітуацыю ў Беларусі як крызісную і небяспечную, якая перашкаджае развіццю грамадства не толькі на сучасным этапе, але і ў перспектыве. Іх спадарожны вынік – істотны ўдар па міжнародным іміджы краіны.

*Заўвага: працэс дэпапуляцыі працягваецца з 1993 г. У выніку насельніцтва Рэспублікі Беларусь скарацілася з 10 243,5 тыс. чалавек (пачатак 1994 г.) да 9 492 тыс. (пачатак 2018 г.), г.зн. на 751,5 тыс. чалавек. Праўда, да 2014 г. у Беларусі налічвалася 9 468 тыс. чалавек, і тады ўпершыню за 20 гадоў колькасць насельніцтва нязначна ўзрасла, а з 2017 г. зноў пайшла на спад.*

Дасягненне і ўтрыманне геапалітычнай раўнавагі Рэспублікі Беларусь у сваім рэгіёне шмат у чым залежыць ад энергетычнай бяспекі. Яе забеспячэнне з'яўляецца прэрагатывай дзяржавы і дасягаецца правядзеннем адзінай палітыкі, сістэмай мер заканадаўчага і іншага характару, адэкватных выяўленым пагрозам і дэстабілізуючым фактарам. Эфектыўнае выкарыстанне паліўна-энергетычных рэсурсаў аказвае істотны ўплыў на канкурэнтаздольнасць тавараў, стабільнасць эканомікі, садзейнічае паляпшэнню экалогіі і вырашэнню праблем змянення клімату. Нерацыянальнае выкарыстанне рэсурсаў прыводзіць да страт у эканоміцы, пагаршае экалагічную абстаноўку, уяўляе сабой пагрозу нацыянальнай бяспецы, вядзе да непажаданых хістанняў знешнеэканамічнага характару [6, с. 53].

Асноўны фактар энергетычнай рызыкі зводзіцца да залежнасці беларускай краіны ад імпарту энерганосьбітаў. Прыродны газ мы атрымліваем толькі ад расійскай кам-

паніі «Газпрам», якая не заўсёды карэктна выкарыстоўвае свой манапалізм на рынку. Знайсці пастаўшчыка – канкурэнта «Газпраму» магчымасці няма. Таму важна выкарыстоўваць іншы шлях – зніжаць энергаёмістасць ВУП. Эксперты лічаць: тыя крыніцы росту, якія краіна выкарыстоўвала з сярэдзіны 1990-х гг., зараз «высахлі». Беларусі неабходна выбудоўваць новую энергетычную стратэгію і больш засяроджвацца на аднаўляемых крыніцах энергіі, чым на датацыях суседняй краіны, бо яны не могуць быць вечнымі. За гады незалежнага развіцця краіна далёка адстала ад развітых еўрапейскіх краін, зрабіла недазвольна мала, каб пазбавіцца ад нафтагазавага праклёну і стварыць паўнавартасны рынак электраэнергіі.

Хоць энергазберажэнне і не падпадае пад крытэрыі энергетычнай бяспекі, але яно здольна прадэманстраваць на практыцы геаэканамічны патэнцыял краіны. Сапраўды, чым менш краіна імпартуе і спажывае энергарэсурсаў пры вытворчасці ВУП, тым меншая яе залежнасць ад знешніх пастаўшчыкоў, тым вышэйшы яе «запас трываласці» ў надзвычайных сітуацыях. Тут вельмі дарэчы выкарыстанне сціплых, але ўсё ж рэальных рэзерваў, здольных генерыраваць «разумную сілу». У нашым выпадку гэта сплаў перадавых тэхналогій, інавацыйных рашэнняў, творчасці інжынерна-навуковых кадраў. Шлях павышэння геаэканамічнага патэнцыялу не новы, аднак эфектыўны. Алгарытм вядомы: працяг структурнай перабудовы прадпрыемстваў дзеля выпуску менш энергаёмістай, але канкурэнтаздольнай, экспартна арыентаванай прадукцыі. Патрэбна далейшая мадэрнізацыя і тэхнічнае пераўзбраенне вытворчасці на базе навукаёмкіх рэсурсных, энергазберагальных і экалагічна чыстых тэхналогій. Эканамісты і юрысты прапануюць распрацаваць і прыняць закон аб выкарыстанні нетрадыцыйных і аднаўляльных крыніц энергіі, удасканаліць нарматыўную прававую базу ў вытворчасці і выкарыстанні мясцовых відаў паліва. Сярод арганізацыйных момантаў вучоныя аддаюць пальму першынства развіццю рынкавых механізмаў фінансавання энергазберажэння ў дзяржсектары, удасканаленню дзяржаўнай экспертызы яго стану і эфектыўнасці, сертыфікацыі прадукцыі з улікам энергаёмістасці і энергазберажэння.

Усё названае дазволіць беларускай эканоміцы нарошчваць ВУП пры нязначным росце спажывання паліўна-энергетычных рэсурсаў. Тым самым дзякуючы ўзрастанню «разумнай сілы» будзе набываць належную раўнавагу геаэканамічны патэнцыял Беларусі. Праяўленне «разумнай сілы» ў энергетычнай сферы можна вызначыць наступнымі індыкатарамі: распрацоўка новых высокаэфектыўных навукаёмістых энергетычных тэхналогій і абсталявання, падрыхтоўка навукова-тэхнічнай базы, аналіз тэхніка-эканамічнага абгрунтавання аптымальных рашэнняў па развіцці паліўна-энергетычнага комплексу, яго мадэрнізацыі і забеспячэнні надзейнай і безаварыйнай працы.

Пэўным геапалітычным рэсурсам валодае мова. Мова – люстэрка нацыянальнай культуры і гісторыі, яе багацце, ідэнтычнасць. Менавіта мова фарміруе мадэль мыслення і, урэшце, паводзіны кожнага члена грамадства. Мова аб’ядноўвае нацыю і прыводзіць усіх яе носьбітаў да агульнай культуры мыслення. Сацыяльныя працэсы, што адбываюцца ў асобным грамадстве, фарміруюцца праз мову. Значыць, мова афармляе сярод сваіх носьбітаў стандартную мадэль мыслення і сацыяльных паводзін. Ужыванне роднай мовы кансалідуе нацыю на вырашэнне агульнадзяржаўных мэтаў – запазычаная мова выступае ўсяго толькі інструментам іх рэалізацыі. У поўнай меры толькі гэтая другая роля праяўляецца ў асяроддзі беларускай нацыі.

Сённяшняя глабалізацыя мае на мэце збудаванне адзінага соцыуму, а мова выконвае ролю сувязнога звяна паміж працэсам глабалізацыі і суб’ектамі яго рэалізацыі. Гэта функцыя замацавалася за англійскай мовай. А ўдзел Беларусі ў працэсах глабалізацыі звязаны з пераадоленнем дадатковага звяна: менавіта беларускі соцыум далучаецца да сусветных працэсаў не праз беларускую мову, а праз рускую. Нельга катэгарычна сцвярджаць, што такі шлях адназначна заганны, відавочна іншае: прыгнечаны,

маргінальны стан беларускай мовы ў пэўнай меры нейтралізуе кансалідуючыя асновы нацыі. Узнікае калізія: з аднаго боку, масавае ўкараненне рускай мовы ў жыццё беларускай нацыі – страта нацыятворчых асноў; а з другога боку, руская мова – гэта зручны для беларусаў сродак камунікацыі паміж культурамі народаў свету. Што ж лепш? «Закрыцца» і не вывучаць блізкай нам мовы, якая мае статус сусветнай, ці бязмежна «адкрыцца» для пранікнення рускага стану мыслення? Абодва варыянты з'яўляюцца крайнасцямі, якіх нельга дапусціць. Неабходна ўзважыць усе станоўчыя і адмоўныя бакі ўплыву рускай мовы на беларускі лад жыцця, пры гэтым абмяжоўваць яе ўздзеянне на традыцыйную культуру і мову. Мова – з'ява пастаянна зменлівая, хоць і захоўвае сваю аснову, свой стрыжань. У большасці краін свету ўласная мова церпіць ад разнастайных негатыўных уздзеянняў. Зараз – гэта апашленне мовы, яе татальная варварызацыя і жарганізацыя. Не толькі лінгвістамі, а і грамадствам у цэлым прадпрымаюцца намаганні дзеля мінімізацыі згаданых тэндэнцый.

Усё выказанае сведчыць, што ў працэсе глабалізацыі, на жаль, беларуская мова перажывае нашмат больш складаны крызісны этап, чым мовы іншых нацый. Дзеля яго пераадолення найперш неабходна прымаць рашучыя меры для захавання нацыянальнай мовы, гісторыі і рэлігіі. Іншыя галіны жыццядзейнасці краіны: эканамічная сфера, навука, адукацыя – маюць падставы больш актыўна інтэгравацца ў глабалізацыйныя працэсы без страт для нацыянальных каштоўнасцей. Зараз стан беларускай мовы не выступае ўмовай росту рэгіянальнага аўтарытэту і геапалітычнага ўплыву Рэспублікі Беларусь. Таксама нацыянальна-палітычныя тэндэнцыі развіцця беларускага грамадства не спрыяюць прасоўванню палітыкі «разумнай сілы». Справа ў тым, што ў гады незалежнасці не сфарміралася кансалідаваная ў нацыянальна-палітычным сэнсе нацыя. Арыентацыі беларусаў ментальна адрозныя і захоўваюць выразны культурна-палітычны кантэкст звароту або ў бок Расіі, або ў бок Захаду. У асяроддзі беларускай палітыка-кіраўнічай эліты таксама адсутнічае адзіны погляд на вызначальны геапалітычны прыярытэт і напрамак цывілізацыйнага развіцця: адны прапануюць разглядаць Беларусь як самадастатковую дзяржаву, другія – як «мост» або «акно» паміж дзвюма цывілізацыямі, трэція сцвярджаюць, што Беларусь павінна «прыйсці ў Еўропу з Расіяй, бо мы занадта ўзаемазалежныя, каб успрымацца асобна».

Не падлягае сумненню, што інфармацыйная бяспека здольная стаць механізмам умацавання нацыянальнай бяспекі і павышэння рэгіянальнага ўплыву Рэспублікі Беларусь. На сучасным этапе інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі з'яўляюцца бясспрэчным фактарам уплыву на развіццё грамадства і адэкватнасці дзяржавы на міжнародныя выклікі. Многія развітыя і ў стадыі развіцця краіны ў поўнай меры ўсвядомілі тыя каласальныя перавагі, якія нясе з сабою развіццё і распаўсюджванне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій. Ні ў кога не выклікае сумнення, што рух да інфармацыйнага грамадства – гэта рух у будучае чалавечай цывілізацыі. Але развіццё інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій і паскораная сусветная глабалізацыя ў сферы інфармацыі і культуры ставяць перад дзяржавай шэраг праблем, датычных захавання гэтай інфармацыі і яе бяспечнага выкарыстання. Інфармацыя набыла статус стратэгічнага нацыянальнага рэсурсу – аднаго з асноўных багаццяў Беларусі, якая прэтэндуе на годнае месца ў міжнароднай супольнасці.

Актыўнае ўкараненне інфармацыйных тэхналогій у самых розных галінах жыццядзейнасці краіны нясе ў сабе пэўныя праблемы, адной з якіх з'яўляецца забеспячэнне рэжыму нацыянальнай бяспекі ў інфармацыйнай сферы. Транзітны стан Беларусі дазваляе ствараць і выкарыстоўваць у сваіх нацыянальных інтарэсах міжнародныя каналы камунікацыі. Інфармацыйная прастора краіны характарызуецца адкрытасцю для ўздзеяння замежных радыё- і тэлекамунікацыйных сродкаў, друкаваных выданняў, глабальнай камп'ютарнай сеткі Інтэрнэт. Але існуе надзвычай высокі ўзровень яе залежнасці

ад замежнага праграмнага забеспячэння і сродкаў інфарматызацыі. Таксама ва Указе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 17.07.2001 № 390 «Аб зацвярджэнні канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь» адзначана, што недасканаласць заканадаўства ў інфармацыйнай сферы стварае магчымасці для маніпулявання інфармацыяй, негатыўнага ўздзеяння на свядомасць людзей, культуру, маральныя і духоўныя падмуркі беларускага грамадства.

Па агульнай накіраванасці пагрозы інфармацыйнай бяспецы падзяляюцца на:

а) пагрозы канстытуцыйным правам і свабодам грамадзян;

б) пагрозы сацыяльнай стабільнасці дзяржаўнага ладу;

в) пагрозы дзяржаўнаму суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці краіны.

Самымі істотнымі пагрозамі дзяржаўнаму ладу з’яўляюцца:

1) злонаўмыснае ўмяшальніцтва ў працэсы выпрацоўкі рашэнняў па кіраванні дзяржавай;

2) злонаўмыснае лагічнае або фізічнае ўздзеянне на інфармацыйныя рэсурсы і аб’екты інфраструктуры краіны;

3) уцечка стратэгічна важнай інфармацыі дзяржаўных органаў;

4) распаўсюджванне за мяжой ілжывай інфармацыі аб Рэспубліцы Беларусь;

5) шпіёнская дзейнасць спецслужбаў замежных дзяржаў;

6) выкарыстанне сродкаў знішчэння аўтаматызаваных сістэм апрацоўкі інфармацыі.

Між тым дзеючыя ў Беларусі арганізацыйныя структуры, прынятыя нацыянальныя заканадаўчыя акты, нарматыўная, метадалагічная і матэрыяльна-тэхнічная базы яшчэ не ў поўнай меры вырашаюць асноватворную задачу ў дадзенай галіне – гарантаваць бяспеку краіны ў інфармацыйнай сферы. У сувязі з пашырэннем сфер прымянення сістэм апрацоўкі і распаўсюджвання інфармацыі назіраецца рост выпадкаў несанкцыянаванага выкарыстання, мадыфікацыі і знішчэння інфармацыі. Пагрозы вылічальнаму і інфармацыйнаму рэсурсам не могуць быць выяўлены, лакалізаваны і ліквідаваны толькі сродкамі асобных апаратных, праграмных сістэм і арганізацыйных мерапрыемстваў. Дзяржаўная праграма «Электронная Беларусь» стварае адзіную інфармацыйную прастору краіны і патрабуе асаблівай увагі да захавання інфармацыі і апераджальных крокаў супраць злачынных дзеянняў па падрыве інфармацыйнай бяспекі.

Пашырэнне доступу і выкарыстання інфармацыі з боку асоб, грамадства, дзяржаў стварыла цэлы шэраг негатыўных наступстваў і ўмоў для парушэння правоў і свабод актараў інфармацыйных адносін. Таму інфармацыйная бяспека ўжо стала самастойным напрамкам міжнароднай бяспекі. Пры вырашэнні яе праблем асаблівым прыярытэтам выступае міжнароднае супрацоўніцтва і ўзаемадзеянне дзяржаўных органаў, юрыдычных і фізічных асоб. Тут варта выдзеліць такія напрамкі, як:

1) аказанне дапамогі ў падрыхтоўцы спецыялістаў па інфармацыйнай бяспецы;

2) забеспячэнне інфармацыйнай бяспекі пры перасячэнні інфармацыйнымі патокамі нацыянальных межаў;

3) барацьба зацікаўленых бакоў з незаконным пранікненнем злачынных элементаў у карпаратыўныя камп’ютарныя сеткі, камерцыйным шпіянажам, спробамі парушэння працаздольнасці камп’ютарных сетак і сетак сувязі агульнага карыстання і негатыўнымі наступствамі ад гэтых дзеянняў.

Намаганні дзяржаўнага кіраўніцтва па ўдасканаленні інфармацыйнай бяспекі пакуль не гарантуюць дасягнення стандартаў сусветных аналагаў. Але ёсць разуменне, што інфармацыя і найноўшыя інфармацыйныя тэхналогіі становяцца сістэмаўтваральнымі фактарамі развіцця палітычнай сістэмы сучаснага беларускага грамадства. Інфармацыйныя рэсурсы і інфармацыйная інфраструктура ў час глабалізацыі выступаюць ужо не толькі ў ролі асноўных сродкаў камунікацыі, але і ў якасці важкага інструмента рэалізацыі дзяржаўнай улады, а таксама сродку ўладкавання краіны ў міжнародным

асяроддзі. Бачыцца, што структурная, інтэлектуальная і тэхналагічная мадэрнізацыя нацыянальнай інфармацыйнай прасторы здольная ўзмацніць рэгіянальную стабільнасць Рэспублікі Беларусь.

У дадзеным ракурсе надзвычай важна пашыраць у міжнародным асяроддзі права дзяржавы і яе суб’ектаў на выніку творчай дзейнасці. Такое права замацоўвае інтэлектуальную ўласнасць, якая не толькі вызначае ўласніка, але і дазваляе азнаёміць міжнародную супольнасць з перавагамі творчых вынікаў, тым самым павышаючы аўтарытэт краіны ў сусветнай гуманітарнай сферы. Ці валодае Беларусь патэнцыялам інтэлектуальнай уласнасці? Так, але ў параўнанні з большасцю еўрапейскіх краін – сціпла. Аднак гэты патэнцыял неабходна і магчыма паўней уключаць у стратэгію «разумнай сілы».

Наспела пара вызваліць істотны рэзерв уздыму еўрапейскай вагі Беларусі з занядбанай гістарычнай самасвядомасці беларусаў. Сёння яна літаральна зруйнавана ўзаемавыключальнымі канцэпцыямі вывучэння беларускай мінуўшчыны. Асаблівую небяспеку нясуць як палярызаваныя гіпотэзы айчынных гісторыкаў, так і адпаведныя гістарычныя «тэорыі» суседзяў па рэгіёне ЦУЕ. Маргіналізацыя гісторыі беларусаў, ігнараванне яе беларускага кантэксту, імкненне даказаць нацыянальную другаснасць і этнічную залежнасць ад суседзяў дысгарманізуюць сучасны стан беларускага грамадства. Зразумела, кансалідацыя беларускай супольнасці на базе навукова абгрунтаваных, аб’ектыўных крытэрыяў і ацэнак гістарычнага мінулага павысіць маральны складнік геапалітычнага патэнцыялу Рэспублікі Беларусь.

Пэўную магчымасць для ўмацавання нацыянальнай самасвядомасці беларусаў здольна даць больш цеснае супрацоўніцтва Беларусі па гуманітарных пытаннях з міжнароднымі арганізацыямі, перадусім еўрапейскімі – Саветам Еўропы і АБСЕ. Узаемадзеянне з імі паспрыяе ўсведамленню беларусамі ўласнай еўрапейскай тоеснасці. Гэтай жа мэце будуць адпавядаць больш шчыльныя сувязі з Саветам па правах чалавека ААН, у прыватнасці выпрацоўка больш змястоўных мер па выкананні міжнародных абавязацельстваў у сферы правоў чалавека.

**Заключэнне**

Беларусі зараз, як і раней, наканавана вагацца паміж двума геапалітычнымі палюсамі – Расіяй і ЕС, то набліжаючыся да аднаго з іх, то аддаляючыся, імкнучыся атрымаць ад гэтага палітычныя, а найперш эканамічныя дывідэнды. Але карысней прытрымлівацца класічнай геапалітычнай формулы для любой малой і сярэдняй краіны: мець больш за два моцныя партнёры, на якіх можна абаперціся, каб атрымаць большую прастору для знешнепалітычнага манеўру. Пажадана афармленне стратэгічнага партнёрства з КНР як з трэцім сусветным сілавым цэнтрам.

Робячы геапалітычны выбар, Беларусь будзе па-ранейшаму больш цягнуцца не да сістэмнай трансфармацыі пад эгідай ЕС (перабудова сацыяльных, эканамічных, палітычных падвалін на заходні лад), а да постсавецкай інтэграцыі ў межах Мытнага саюза і ЕАЭС (элементы свабоднага рынку і палітычнага партнёрства).

Зыходзячы з выкладзенага разумення геапалітычнай сітуацыі, разумна дапусціць, што пачаты дыялог Еўрасаюз – Беларусь будзе працягвацца, але вялікага прарыву не будзе. ЕС спрабуе інвеставаць, каб Беларусь уласнай культурнай спадчынай і некаторымі стандартамі замацоўвала сваю еўрапейскую самасвядомасць, аднак у Расіі ёсць усе рычагі для таго, каб трымаць Беларусь у сферы свайго ўплыву, не акупіруючы яе, а ўтрымліваючы ў сваёй арбіце праз агульныя дзеянні (удзел у ЕАЭС, ваенных вучэннях і да т.п.).

Рэзка пашырылася ў апошнія гады і месяцы мазаіка канфрантацыйных кропак сутыкнення паміж Расіяй і Захадам. Пераважная большасць такіх кропак не закранае нават з большага непасрэдныя інтарэсы Беларусі. Аднак кантэкст «саюзніцкіх абавяза-

цельстваў» перад Расіяй будзе ўсё больш ускладняць рэалізацыю ўласных знешнепалітычных амбіцый афіцыйнага Мінска. На Захадзе пераважае меркаванне, што такія вайсковыя вучэнні, як «Захад – 2017», дэманструюць не толькі палітычнае супрацоўніцтва, але і паказваюць, што Беларусь без цяжкасці можа стаць часткай мілітарысцкай сілы Расіі. Разам з тым варта адзначыць, што Беларусь вымушана прымяраць на сябе і паняцце агульных з Расіяй пагроз і ворагаў: прысутнасць НАТА побач з Беларуссю лічыцца пагрозай для абедзвюх краін.

Беларусь патэнцыяльна можа быць у рэгіёне ЦУЕ ці фактарам стабільнасці, ці знешнім раздражняльнікам. Першая роля дазваляе ёй быць саўдзельніцай выбудоўвання новай мадэлі адносін Захаду і Усходу. Абнаўленне наспела, і нядаўняя (летам 2018 г.) сустрэча Трампа і Пуціна стала сведчаннем такой патрэбы. Як уяўляецца, гэта, бадай, адзіны пазітыўны вынік згаданай сустрэчы. Дзякуючы ёй патэнцыяльна крыху аслабляецца ціск «жорнаў», у якіх апошнім часам перамолваліся геапалітычныя інтарэсы Беларусі. Маецца на ўвазе новая рэчаіснасць, датычная прасторы Усходняй Еўропы як зоны інтарэсаў не толькі Расіі, але і Захаду. Менавіта так варта расцэньваць гатоўнасць Расіі і ЗША сумесна шукаць падыходы, каб дамаўляцца аб зніжэнні канфліктнасці ва Усходняй Еўропе, найперш ва Украіне. Гэта дае надзею, што Беларусь не стане полем саперніцтва за ўплыў, а ўдзельніцай стварэння мадэлі супрацоўніцтва на глабальным узроўні.

Такая роля па сілах Мінску і на рэгіянальным узроўні. Бясспрэчна, Беларусь – выключны прыклад краіны на постсавецкай прасторы, якая захавала дружалюбныя і партнёрскія адносіны з суседзямі. І тут услед за спадзяваным глабальным пацяпленнем яна мае падставы стаць у ЦУЕ актыўным актарам новай мадэлі адносін супрацоўніцтва замест цяперашняй канфрантацыі. Беларусь сапраўды можа іграць ролю сувязнага элемента, у чым будуць аб’ектыўна зацікаўлены ў новых геапалітычных абставінах і Расія, і Захад. Яны паспрыяюць пераадоленню існуючай у рэгіёне турбулентнасці, чаго нявздольная зрабіць асобна ні адна краіна гэтай прасторы, нават жыццёва зацікаўленая, у тым ліку Беларусь.

Аднак беларускаму кіраўніцтву трэба ўсведамляць: калі сітуацыя зменіцца і Масква пазбавіцца ўпэўненасці, што яе інтарэсы ў Беларусі бяспечныя, то, ёсць верагоднасць, пачне рашучыя дзеянні, каб абараніць свае пазіцыі там. Таму, відаць, самым непажаданым варыянтам для краіны было б аказацца цэнтрам перакрыжаваных геапалітычных інтарэсаў ЕС і Расіі. Беларускай дзяржаве нельга ставіць пад удар саюзніцкую аснову двухбаковых адносін. Праз такі дысбаланс ёй наканавана існаваць і развівацца ва ўмовах геапалітычнай нестабільнасці.

Падкрэслім: з пункту погляду геапалітычнай эфектыўнасці найбольшыя дывідэнды Рэспубліцы Беларусь прынясуць якраз актыўныя дзеянні ў знешняй палітыцы і пытаннях бяспекі. Нядаўні вопыт гэта пацвярджае: аўтарытэт падчас процістаяння Захаду і Усходу краіна заваявала менавіта такімі захадамі, а не эканамічнымі, ваеннымі ці палітычнымі мерамі. Заклікі кіраўніцтва будаваць і ўмацоўваць масты: палітычныя, эканамічныя, гуманітарныя – паміж краінамі і рознымі інтэграцыйнымі аб’яднаннямі Захаду і Усходу з адабрэннем успрымаюцца ў свеце. Гэта дае Беларусі дадатковыя бонусы для ўмацавання стрыжня сваёй міжнароднай вагі: размяшчэння на скрыжаванні гандлёва-эканамічных шляхоў і ўладкавання на стыку Еўропы і постсавецкай прасторы.

І, безумоўна, Беларусі карысна ўзмацніць сваю прысутнасць ва ўсіх міжнародных арганізацыях, уключаючы давядзенне да станоўчай развязкі працэсу ўступлення ў СГА, пашыраць эканамічнае і іншае супрацоўніцтва з партнёрамі і будаваць самадастатковую эканоміку.

Геапалітычны стан Беларусі, яе гістарычны вопыт, культурныя традыцыі, навукова-тэхнічны, эканамічны і інтэлектуальны патэнцыял – гэта спрыяльныя перадумовы

для развіцця ў якасці еўрапейскай дзяржавы, паўнавартаснага ўдзельніка еўрапейскіх працэсаў. Для краіны ўваходжанне ў еўрапейскую цывілізацыйную прастору будзе азначаць адначасова паскарэнне інтэграцыі ў сусветную супольнасць.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ


1. СБ. Беларусь сегодня. – 2017. – 16 нояб.
2. Шадурский, В. Принцип многовекторности во внешней политике Беларуси / В. Шадурский // Проблемы внешней политики и безопасности: Беларусь – Польша: история и перспективы сотрудничества / редкол.: А. В. Русакович (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2009. – С. 37–46.
3. Геапалітычнае месца Беларусі ў Эўропе і сьвеце / пад рэд. В. Булгакава. – Варшава : ELIPSA, 2006. – 242 с.
4. СБ. Беларусь сегодня. – 2016. – 22 нояб.
5. Белорусы и рынок. – 2018. – 29 июля.
6. Никитенков, В. И. Энергетическая безопасность – важнейшая составляющая национальной безопасности Республики Беларусь / В. И. Никитенков, Л. П. Никитенкова // Национальная безопасность. Правовые, социокультурные и экономические основы : материалы II Междунар. науч.-практ. конф., Москва, 29 янв. – 4 февр. 2007 г. – М., 2007. – С. 53.


Рукапіс паступіў у рэдакцыю 24.01.2019

***Chasnouski M.E.*** **The European Aspect of Current Geopolitics of the Republic of Belarus**

*The study focuses on the European aspect of the geopolitics of Belarus. The starting point of the analysis is the following: given its geopolitical weight the country in present-day situation can function in the international arena only in a team. Its optimal geopolitical choice to achieve external goals in the European area is having two or more strong partners to rely on in order to ensure the possibility of political maneuvering, and the strategy to achieve a success should involve a policy of «smart power», non-confrontational relationship, dialogue and compromise. Maintaining the geopolitical balance of the country in the European processes should be supported by domestic capabilities: innovative capacity of the country, national and political consolidation of the society.*